**УДК 94(476) 1921/1939**

# УЗАЕМААДНОСІНЫ БЕЛАРУСКІХ ПАЛАНАФІЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ З ПОЛЬСКІМІ ЎЛАДАМІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

***А.С. ГОРНЫ***
**(*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы*)**

*Закранаецца малавывучаная ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі праблема ўзаемадзеяння беларускіх паланафільскіх арганізацый з польскімі ўладамі ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Раскрываюцца асноўныя формы супрацоўніцтва з польскімі ўладамі такіх арганізацый, як "Краёвая сувязь", Часовая беларуская рада, група Луцкевіча – Астроўскага і інш. Аўтар прыходзіць да высновы, што падтрымка ўладамі прапольскіх сіл у беларускім грамадстве Заходняй Беларусі насіла абмежаваны характар і не выходзіла за рамкі палітыкі паланізацыі беларусаў.*

**Уводзіны.** Улады любой дзяржавы зацікаўленыя ў існаванні ўнутры грамадства груп, якія б праяўлялі вялікую прыхільнасць да існуючага дзяржаўнага ладу і трансліравалі ідэалагічныя дзяржаўныя ўстаноўкі на іншыя пласты грамадства. Не была выключэннем і міжваенная Польская рэспубліка. Наяўнасць у краіне значнай колькасці нацыянальных меньшасцяў з моцнымі замежнымі цэнтрамі прымушала ўлады вылучаць сваіх прыхільнікаў у розных грамадскіх асяродках і аказваць ім ідэалагічную, маральную і фінансавую падтрымку. Менавіта паланафільская плынь беларускага нацыянальнага руху, прадстаўнікі якой арыентаваліся на польскія ўлады, павінна была стаць транслятарам праўрадавых ідэй для беларускай меншасці Польшчы. З іншага боку, беларускія паланафільскія арганізацыі разглядалі польскія ўлады як тую інстанцыю, з якой у першую чаргу неабходна супрацоўнічаць і знаходзіць агульную мову дзеля вырашэння праблем беларускага насельніцтва і пашырэння сярод яго прапольскіх ідэй.

Праблема кантактаў беларускіх паланафілаў з польскімі адміністрацыйнымі структурамі Заходняй Беларусі пэўным чынам была асветлена ў беларускай і польскай гістарыяграфіі. Апошнім часам, дзякуючы ўвядзенню ў навуковы ўжытак новых крыніц, грунтоўна распрацоўваецца тэма супрацоўніцтва беларускіх дзеячоў, у тым ліку і паланафільскай арыентацыі, са спецслужбамі міжваеннай Польшчы. Гэтай праблеме прысвечаны працы беларускіх даследчыкаў А. Чарнякевіча і А. Пашкевіча [1; 2; 3]. Некаторыя аспекты ўзаемастасункаў паланафілаў з уладамі Польшчы былі адлюстраваны ў працах польскіх гісторыкаў К. Гамулкі [4], І. Янушэўскай-Юркевіч [5], М. Галэндэка [6]. Разам з гэтым, на сённяшні дзень прадстаўляецца даволі актуальным комплексны аналіз пазначанай праблемы з характарыстыкай усіх магчымых накірункаў супрацоўніцтва беларускіх паланафілаў з інстытутамі польскай улады.

**Асноўная частка.** Першай арганізацыяй, якую стварылі беларускія паланафілы на тэрыторыі Заходняй Беларусі вясной 1921 г., была "Краёвая сувязь" на чале з П. Аляксюком. Яе мэтай было абуджэнне беларускай свядомасці ў духу краёвага саюза з Польшчай. Прадстаўнікі арганізацыі разлічвалі знайсці падтрымку сваёй дзейнасці ў польскіх улад і непрызнанага дзяржаўнага ўтварэння Сярэдняй Літвы. На адрас польскага ўраду у Варшаве і кіраўніцтва Сярэдняй Літвы былі дасланы некалькі патрабаванняў: выдаць субсідыю на арганізацыйна-палітычную працу "Краёвай сувязі", прафінансаваць выданне яе друкаваных органаў, адчыніць беларускія пачатковыя школы, гімназію і настаўніцкую семінарыю, забяспечыць кааператывы, падкантрольныя паланафілам, дапамогай і гандлевымі прэферэнцыямі [7, арк. 7–7 адв.]. Аднак польскія ўлады не спяшаліся падтрымліваць нават памяркоўныя і лаяльныя сілы беларускага руху, бо баяліся, што пад іх шыльдай могуць дзейнічаць антыпольскія элементы. Цэнтральны камітэт "Краёвай сувязі" на працягу пяці месяцаў вёў перамовы з уладамі наконт падтрымкі паланафільскага руху, якія скончыліся безвынікова [7, арк. 30 адв.]. Дэлегат польскага ўраду ў Сярэдняй Літве згадзіўся, дзеля бліжэйшага азнаямлення з арганізацыяй, прафінансаваць толькі выданне паланафільскай газеты "Jednasc" [8, арк. 36]. Акрамя гэтага, паланафілы, дзякуючы цыркуляру віленскага старасты, маглі без перашкод пашыраць сваю прэсу на тэрыторыі Віленшчыны, а падкантрольныя "Краёвай сувязі" кааперaтывы атрымлівалі ад Дэпартамента харчавання Сярэдняй Літвы на льготных умовах значную колькасць прадукцыі [9; 10].

Неабходна заўважыць, што лідар "Краёвай сувязі", П. Аляксюк, знаходзіўся ў сталай перапісцы з дэлегатам польскага ўраду ў Сярэдняй Літве. У сваіх лістах Аляксюк заклікаў улады выпрацаваць выразную лінію адносна беларускіх прапольскіх груп і пачаць аказваць ім маральную і матэрыяльную падтрымку [7, арк. 31]. Спробы прадстаўнікоў арганізацыі наладзіць стасункі ў першую чаргу з цывільнымі ўладамі Сярэдняй Літвы, менавіта – дэлегатурай польскага ўраду, былі невыпадковыя. Па-першае, да чэрвеня 1921 г. дэлегатам польскага ўраду ў Вільні працаваў У. Рачкевіч, з якім Аляксюк меў цесныя ўзаемаадносіны яшчэ падчас польска-савецкай вайны [11, с. 368]. Па-другое, на гэты выбар значна ўплываў палітычны канфлікт і канкурэнцыя паміж рознымі інстытутамі польскай улады, у прыватнасці, паміж II аддзелам польскага Генштаба (дэфензіва), вакол якога аб'ядноўваліся прыхільнікі Ю. Пілсудскага, і

мясцовым кіраўніцтвам Сярэдняй Літвы, якое карысталася падтрымкай міністэрства замежных спраў Польшчы. Польскія спецслужбы мелі ўласную пазіцыю адносна беларускага пытання, распрацоўваючы ў 1921 г. у гэтым кірунку, напрыклад, праект Беларускага дзяржаўнага камітэта на чале з Я. Ладновым, які павінен быў адцягнуць беларускія эліты ад сімпатый у бок Літвы [3, s. 852; 12, s. 48–49]. Таму акцыю "Краёвай сувязі" дэфензіва лічыла непатрэбнай і нават небяспечнай, а самога Аляксюка адносіла да авантурыстаў, які толькі прыкрываўся паланафільствам, а насамрэч шукаў сціслых кантактаў з антыпольскімі арганізацыямі. Са свайго боку, П. Аляксюк зазначаў, што палітыка II аддзела з'яўлялася шкоднай, і надаваў вялікую ролю ў вырашэнні беларускай праблемы менавіта міністэрству замежных спраў Польшчы і мясцоваму кіраўніцтву Сярэдняй Літвы [13, арк. 43–44, 47]. Дэфензіва ўсялякімі сродкамі імкнулася супрацьдзейнічаць лідару "Краёвай сувязі", нават здзейсніўшы ў пачатку чэрвеня 1921 г. яго арышт на некалькі дзён [11, c. 368–369].

Пераломам у адносінах польскіх улад да "Краёвай сувязі" надышоў толькі ў канцы 1921 г. Ён быў абумоўлены набліжэннем выбараў у сейм Сярэдняй Літвы (Віленскі сейм). Палякам быў неабходны ўдзел у выбарчай кампаніі беларускага насельніцтва, каб пацвердзіць яе легітымнасць перад міжнароднай супольнасцю. У гэтых умовах улады пачалі наладжваць стасункі з "Краёвай сувяззю" [7, арк. 25]. Міністэрства замежных спраў Польшчы рэкамендавала кіраўніцтву Сярэдняй Літвы выдаткаваць субсідыі для паланафілаў і забяспечыць ім дапамогу ў падрыхтоўцы да выбараў [6, c. 502]. Можна дапусціць, што дзякуючы польскім субсідыям прадстаўнікі "Краёвай сувязі" ў снежні 1921 г. арганізавалі т. зв. "з'езд беларускага сялянства, партый і арганізацый Заходняй Беларусі", на якім пацвердзілі ідэалы польска-беларускага збліжэння. На з'ездзе была сфарміравана адмысловая дэлегацыя ў складзе П. Аляксюка, А. Паўлюкевіча, С. Абрамчыка, М. Каспяровіча, П. Калечыса, якая накіравалася ў Варшаву да вышэйшага дзяржаўнага кіраўніцтва Польшчы. У польскай сталіцы дэлегацыя беларускіх паланафілаў наведала прэм'ер-міністра А. Панікоўскага, міністра ўнутраных спраў С. Даўнаровіча і міністра замежных спраў К. Скірмунта. Сябры польскага ўраду запэўнілі дэлегатаў, што па меры магчымасці будуць праводзіць у жыццё ўсе дамаганні беларускага насельніцтва і ў першую чаргу – справу адчынення новых беларускіх школ. Акрамя гэтага, прэм'ер-міністр Польшчы абяцаў палепшыць долю беларускіх бежанцаў і нават вылучыў на гэтую справу 200 000 марак [14]. Тым не менш, актывізацыя кантактаў паланафілаў з уладамі і зацікаўленасць апошнімі беларускім пытаннем з'яўлялася ўсяго толькі прапагандысцкім крокам. Пасля таго, як "Краёвая сувязь" цалкам правяліла сваю выбарчую кампанію ў Віленскі сейм, польская адміністрацыя спыніла яе матэрыяльную і маральную падтрымку [3, s. 845]. Гэта прывяло да самаліквідацыі арганізацыі ў сакавіку 1922 г.

Імкнулася наладзіць трывалыя кантакты з польскімі ўладамі і Арганізацыя беларускіх безпартыйных актывістаў (АББА), утвораная ў сакавіку 1922 г. Яе прадстаўнікі выступалі за збліжэнне з Польшчай і актыўна агітавалі супраць беларускіх левых і нацыянальна-дэмакратычных груп [4, s. 64]. Лідар "актывістаў" Я. Міткевіч меў стасункі з уладамі на розных узроўнях. Прынамсі, сустракаюцца сведчанні аб супрацоўніцтве Міткевіча ў якасці канфідэнта з польскай дэфензівай [2, c. 42]. Акрамя гэтага, выяўлены два мемарыялы, пададзеныя прадстаўнікамі АББА ўладам. У першым мемарыяле да міністра ўнутраных спраў Польшчы, складзеным у 1922 г., падкрэслівалася, што "актывісты" актыўна пашыраюць сярод беларускага насельніцтва Гродзеншчыны ідэю польскай дзяржаўнасці, але маюць нязначную апеку з боку ўлады, у тым ліку і фінансавую. Паланафілы пазначалі, што статут іх арганізацыі, зарэгістраваны толькі ў Гродзенскім старостве, не быў зацверджаны ў Міністэрстве ўнутраных спраў [15, арк. 2]. Значна завышаючы сваю палітычную вагу, Міткевіч патрабаваў ад міністэрства таксама і фінансавыя субсідыі для пашырэння паланафільскай прапаганды праз прэсу. На выданне газеты "Беларускі шлях" ён прасіў выдаткаваць штомесячна 300–400 тыс. марак, а на выданне новага штодзённіка ці тыднёвіка "Беларускі звон" – ад 600 тыс. да 2 млн. марак [15, арк. 3]. Паказальна, што апошняя назва газеты супадала з назвай таго беларускага выдання, якое актыўна крытыкавала дзейнасць Міткевіча. Нам невядома ці прадаставілі ўлады гэтую суму, але "Беларускі шлях" перастаў выходзіць ужо ў жніўні 1922 г., а штодзённік АББА "Беларускі звон" так і не пабачыў свет.

Цікавасць уяўляе другі мемарыял, складзены ў 1924 г., калі Міткевіч пасля фактычнага заняпаду разлічваў рэанімераваць Арганізацыю беларускіх безпартыйных актывістаў. На пачатку дакумента ён зноў завысіў палітычнае значэнне АББА, падкрэсліваючы, што яна шмат зрабіла для ліквідацыі літоўска-беларускага і камуністычнага партызанскага руху. Заняпад дзейнасці "актывістаў" Міткевіч тлумачыў адсутнасцю фінансаў. "Больш дабра для Польшчы, чым арганізацыя актывістаў, не прынесла ніводная з беларускіх арганізацый, аднак нашая арганізацыя не атрымлівала на гэтыя мэты фінансавай дапамогі ад ураду" – падкрэсліваў лідар АББА [16, арк. 33]. Паказваючы дэструктыўную ролю Беларускага пасольскага клуба і віленскага Беларускага нацыянальнага камітэта для польскай дзяржаўнасці, прадстаўнікі АББА прапанавалі ўладам свае паслугі ў барацьбе з гэтымі беларускімі групамі. Дзеля гэтага была распрацавана адмысловая праграма дзеянняў, якая ўтрымлівала наступныя пункты: 1) перанесці працу АББА з Гродзеншчыны ў Навагрудскае ваяводства і ўтварыць сядзібу арганізацыі ў Слоніме ці Барнавічах; 2) арганізаваць беларускі з'езд і ўтварыць новую паланафільскую групу пад прапагандысцкай назвай "Адра-

джэнне Беларусі”; 3) у якасці канкурэнта Цэнтральнай школьнай беларускай рады ўтварыць новую школьную арганізацыю памяркоўнага кірунку, якая б перацягнула на свой бок беларускіх настаўнікаў і інтэлігенцыю; 4) арганізаваць новы Беларускі нацыянальны камітэт па прынцыпу лаяльнасці да Польшчы; 5) дамагацца адкрыцця змешаных польска-беларускіх школ з мэтай стрымання антыпольскай агітацыі сярод вучняў; 6) абараняць хрысціянскі промысел і гандаль на т.зв. “крэсах” ад манаполіі яўрэйскага капітала; 7) мець сталыя кантакты з мясцовымі ўладамі і атрымліваць ад іх маральную і фінансавую дапамогу [16, арк. 34–36]. У прапагандысцкіх мэтах паланафілы абяцалі выкарыстоўваць пастулат аўтаноміі Заходняй Беларусі, але насамрэч цалкам прызнавалі ўнітарнасць Польскай дзяржавы. Тым не менш, нягледзячы на гэты распрацаваны план, намаганні Міткевіча і яго прыхільнікаў былі не заўважаны ва ўрадавых колах. Верагодна гэта было выклікана тым, што згаданыя дзеячы не выклікалі вялікага даверу, бо фактычна з’яўляліся палітычнымі авантурыстамі, неаднаразова абвінавачанымі ў розных фінансавых махінацыях [17, s. 299].

У верасні 1924 г. у Вільні ўтварылася новая паланафільска арганізацыя пад назвай Часовая беларуская рада (ЧБР, з 1926 г. мела назву Беларуская нацыянальная рада). Адной з палітычных задач ЧБР з’яўлялася ўстаноўка шчыльных зносін з прадстаўнікамі мясцовай і цэнтральнай улады для вырашэння праблем беларускай меншасці [18, арк. 5]. Старшыня арганізацыі, доктар А. Паўлюкевіч, неўзабаве пачаў рэалізоўваць гэтую задачу, арганізуючы розныя аўдыенцыі і сустрэчы з вышэйшымі польскімі чыноўнікамі. Так, 3–10 кастрычніка 1924 г. дэлегацыя ЧБР правяла ў Варшаве некалькі сустрэч з членамі Савета міністраў Польшчы, у тым ліку з прэм’ер-міністрам У. Грабскім. Польскаму кіраўніцтву былі выказаны прапановы аб правядзенні ў Заходняй Беларусі рэформы школьніцтва, мясцовага самакіравання, падкрэслівалася неабходнасць прадастаўлення дапамогі гаспадаркам былых бежанцаў [19]. Амаль падобныя пытанні закраналіся і падчас сустрэч з віцэ-прэм’ерам С. Тугутам, міністрамі ўнутраных спраў і асветы, дэлегатам ураду ў Вільні, куратарам Віленскай навучальнай акругі, мітрапалітам Польскай праваслаўнай царквы і інш. Усяго, паводле падліку аўтара, які абапіраўся на матэрыялы друкаванага органа ЧБР “Грамадскі голас”, у 1924–1925 гг. прадстаўнікі арганізацыі здзейснілі каля 10 сустрэч з польскім кіраўніцтвам.

Неабходна заўважыць, што падчас сустрэч з польскімі чыноўнікамі паланафілам удавалася дабіцца невялікіх саступак для беларусаў. Так, у 1925 г. пасля наведвання Міністэрства асветы дэлегацыя ЧБР змагла атрымаць дазвол на арганізацыю беларускіх курсаў для настаўнікаў пачатковых школ у Вільні і Кракаве [20, арк. 345]. Тым не менш, падчас згаданых аўдыенцый не заўсёды абмяркоўваліся праблемы беларусаў у Польшчы. Хутчэй за ўсё, дзеля прапагандысцкага эфекту ў паланафільскай прэсе завышаліся змест і значэнне гэтых сустрэч, якія насамрэч не мелі вялікага ўплыву на грамадска-палітычнае і сацыяльнае жыццё беларускага насельніцтва. У большасці выпадкаў прадстаўнікі ЧБР шукалі ў кабінетах польскіх чыноўнікаў матэрыяльную падтрымку сваёй дзейнасці. Напрыклад, пасля візіта да віцэ-прэм’ера С. Тугута А. Паўлюкевіч заявіў сваім прыхільнікам, што ўлады абяцалі вылучыць канцэсіі на аўтобусныя перавозкі і ўтрыманне аптовых складоў тытуню, даходы з якіх павінны былі ісці на развіццё паланафільскага руху [20, арк. 249].

У маі 1926 г. ЧБР, адзіная сярод усіх беларускіх арганізацый Заходняй Беларусі, падтрымала майскі пераварот у Варшаве, у ходзе якога да ўлады прыйшлі прыхільнікі маршала Ю. Пілсудскага. 15 чэрвеня 1926 г. ЧБР на надзвычайным паседжанні пастанавіла даслаць маршалу Пілсудскаму віншавальную тэлеграму, у якой між іншым, пазначалася: “Часовая Беларуская Рада, прадстаўляючы тое беларускае грамадзянства, якое ў злучнасці і братняй, згоднай супольнай працы з польскім народам жадае збудаваць сабе лепшую будучыню, вітае Цябе, Правадыр, у гэтую вялікую гістарычную хвілю пераломy, аддае гонар і пашану і складае сардэчныя пажаданні давядзення да канца задуманнай санацыйнай акцыі ў цэлай Польшчы” [11, с. 309]. Адразу пасля выхаду тэлеграмы, на старонках газеты “Беларускае слова” прыхільнікі ЧБР пачалі праводзіць агітацыю ў падтрымку Пілсудскага. Напрыклад, у даволі рэзкай форме яны патрабавалі, каб беларускія паслы Сейма падчас выбараў прэзідэнта Польшчы аддалі свае галасы за кандыдатуру маршала [21].

Пасля акрэслення сваёй пазіцыі, А. Паўлюкевіч выехаў у Варшаву з мэтай усталявання стасункаў з новымі ўладамі. Новапрызначаны прэм’ер-міністр К. Бартэль падчас сустрэчы з лідарам беларускіх паланафілаў абяцаў фінансавую дапамогу, але, можна дапусціць, што ўзамен прапанаваў ЧБР правесці на тэрыторыі Заходняй Беларусі шырокую кампанію па падтрымцы Пілсудскага [11, с. 309]. Падобная акцыя змагла б у пэўнай ступені стварыць станоўчы вобраз новых улад сярод беларускага насельніцтва, большасці якога былі яшчэ малавядомы акалічнасці варшаўскіх падзей.

Паводле справаздачы, надрукаванай у газеце “Беларускае слова”, у канцы мая 1926 г. сябры ЧБР правялі ў Заходняй Беларусі 21 мітынг: 6 – у Вілейскім павеце, па тры – у Нясвіжскім і Лідскім паветах, 2 – у Валожынскім павеце, па аднаму – у Слонімскім, Баранавіцкім, Навагрудскім, Пастаўскім, Браслаўскім, Дзісненскім і Маладзечанскім паветах [22]. У справаздачах польскай паліцыі і ваяводскай адміністрацыі намі знойдзена характарыстыка 11 падобных мерапрыемстваў, што, аднак не выключае лічбы, пададзенай у паланафільскай газеце (табліца 1). Фактычна ўсе яны мелі аднолькавы змест: характарыстыка падзей пераварота ў Варшаве, пазітыўная ацэнка прыходу да ўлады прыхільнікаў Пілсудскага,

прыняцце рэзалюцыі з заклікам да беларускіх дэпутатаў падтрымаць кандыдатуру Пілсудскага падчас выбараў прэзідэнта Польшчы [23, арк. 119,170; 24, арк. 139,140; 25, арк. 103–104]. Больш таго, пры ўдзеле прадстаўніка ЧБР Б. Друцкага-Падбярэзскага каля 15 вёсак і мястэчак Гродзеншчыны даслалі ў Варшаву тэлеграму з выказваннем падтрымкі новым уладам [26, арк. 88–89]. Тым не менш гэтая акцыя не мела значнага ўздзеяння на грамадска-палітычнае жыццё краю і выбар беларускіх дэпутатаў. Сябры БПК як і сеймавага клубу БСРГ падчас выбараў прэзідэнта ўстрымаліся ад галасавання і адмовіліся падтрымаць кандыдатуру Пілсудскага [27].

Табліца 1

Мітынгі ў падтрымку майскага пераварота і Ю. Пілсудскага, скліканыя Часовай беларускай радай у Заходняй Беларусі ў маі 1926 г.

| Дата | Мясцовасць | Арганізатар мітынга | Колькасць прысутных |
|---|---|---|---|
| 25 мая | Вільня | А. Паўлюкевіч | Не адбыўся з-за адсутнасці слухачоў |
| 26 мая | Паставы | У. Більдзюкевіч | 100 |
| 26 мая | Нясвіж | А. Паўлюкевіч | 700 |
| 27 мая | в. Краснае Вялейскага пав. | Т. Вернікоўскі | 300 |
| 27 мая | мяст. Радашковічы Вялейскага пав. | Т. Вернікоўскі | 300 |
| 27 мая | мяст. Клецк Нясвіжскага пав. | А. Паўлюкевіч | 100 |
| 27 мая | в.Сіняўка Нясвіжскага пав. | А. Паўлюкевіч | 120 |
| 27 мая | мяст. Шаркаўшчына Дзісненскага пав. | У. Більдзюкевіч | 400 |
| 28 мая | Баранавічы | А. Паўлюкевіч | 100 |
| 28 мая | в. Аляхновічы Вялейскага пав. | Т. Вернікоўскі | 15 |
| 29 мая | в.Гародзькі Валожынскага пав. | А. Кабычкін | 100 |

У 1920-я гг. польскія ўлады імкнуліся разгарнуць і падтрымаць у Заходняй Беларусі яшчэ шэраг палітычных праектаў беларускіх паланафілаў. Найбольш цікавым з іх з'яўляецца Цэнтральны камітэт беларускіх спраў, пад шыльдай якога дзейнічала некалькі актывістаў. Ініцыятарам утварэння гэтай арганізацыі быў Феліцыян Цяўлоўскі – малавядомая постаць у беларускім нацыянальным руху, які пачынаў сваю палітычную кар'еру ў польскіх сацыялістычных арганізацыях пачатку ХХ ст. [11, с. 280]. У канцы верасня 1924 г. ён абвясціў аб стварэнні Цэнтральнага камітэта па беларускіх справах і адразу ж пачаў шукаць сувязі з рознымі ўрадавымі ведамствамі Польшчы. Можна дапусціць, што "беларуская справа" была для Цяўлоўскага ўсяго толькі карысным бізнесам, бо якраз у часы агульнай радыкалізацыі беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы ўладам былі патрэбны актыўныя прапагандысты прапольскіх ідэй, праца якіх добра фінансавалася. Аднак палякі ў гэтай справе значна памыліліся, зрабіўшы стаўку на малавядомых і неаўтарытэтных дзеячаў. Першапачаткова, пасля прапановы польскай дэфензіве выкарыстоўваць Цэнтральны камітэт па беларускіх справах у вывядоўчых і прапагандысцкіх мэтах, Цяўлоўскі атрымаў адмову [28, с. 68]. Аднак гэтую ідэю неўзабаве падхапіла Міністэрства ўнутраных спраў, якое разлічвала з дапамогай Цяўлоўскага знізіць палітычную напружанасць у т.зв. "крэсах". Асабліва моцна паланафіла падтрымліваў чыноўнік міністэрства па прозвішчы Руткоўскі, які не меў ніякага ўяўлення аб асаблівасцях тагачаснага беларускага палітычнага жыцця ў Польшчы [29, s. 253].

Неабходна заўважыць, што ў адрозненні ад іншых беларускіх паланафільскіх арганізацый Ф. Цяўлоўскі імкнуўся выйсці за межы віленскага палітычнага асяроддзя і праводзіць агітацыю ў правінцыі, перамяшчаючы такім чынам вектар беларускага паланафільства з Віленшчыны ў Навагрудскае ваяводства. Адмыслова дзеля гэтага, 29 студзеня 1925 г. Міністэрства ўнутраных спраў накіравала навагрудскаму ваяводзе Янушайцісу паведамленне, у якім заклікала кіраўніка Навагрудчыны ўзяць пад асабісты кантроль дзейнасць Цяўлоўскага і не ствараць яму ніякіх перашкод. У дакуменце, між іншым, падкрэслівалася: "Пан Феліцыян Цяўлоўскі накіраваўся ў Навагрудскае ваяводства з мэтай разгортвання сярод беларускага насельніцтва дзейнасці, накіраванай супраць бальшавіцкай агітацыі, а таксама з мэтай выхавання гэтага насельніцтва ў духу, прыхільным да Польскай дзяржавы… Выезд пана Цяўлоўскага адбыўся са згоды Міністэрства ўнутраных спраў, якое да акцыі пана Цяўлоўскага адносіцца прыхільна" [30, арк. 3]. Маючы санкцыю вышэйшых улад і пратэкцыю мясцовай адміністрацыі, Цяўлоўскі пачаў арганізоўваць у розных мястэчках і вёсках ваяводства падчас кірмашоў агітацыйныя мітынгі, на якіх заклікаў насельніцтва падтрымліваць дзеянні польскіх улад па барацьбе з беларускімі апазіцыйнымі групамі. Аднак гэтыя мерапрыемствы не карысталіся значным поспехам сярод сялян, якія лічылі Цяўлоўскага "здраднікам, падкупленным уладамі" [31, арк. 98].

На рубяжы 1920–1930-х гг. у Заходняй Беларусі на праўрадавыя пазіцыі перайшлі некаторыя вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху. Частка былых прыхільнікаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады (А. Луцкевіч, Р. Астроўскі, Я. Шнаркевіч, У. Самойла і інш.) прапанавалі шукаць кампрамісы і кантакты з санацыйным урадам Польшчы з мэтай хоць нейкім чынам захаваць культурна-нацыянальныя здабыткі беларусаў. Па гэтай прычыне дадзеная група ў заходнебеларускім палітычным асяроддзі атрымала назву “беларускай санацыі” альбо групы Луцкевіча – Астроўскага. Для каардынацыі сваёй дзейнасці ў жніўні 1930 г. яна ўтварыла Цэнтральны саюз беларускіх культурна-асветніцкіх і гаспадарчых арганізацый (Цэнтрасаюз), у межах якога імкнулася аб’яднаць працу амаль усіх беларускіх непалітычных таварыстваў, саюзаў і школ [32, с. 183–184].

Сацыяльна-палітычныя і культурныя праблемы беларускага насельніцтва прадстаўнікі групы Луцкевіча – Астроўскага разлічвалі вырашыць праз перамовы з вышэйшым кіраўніцтвам Польшчы. У беларускай прэсе падавалася інфармацыя пра сустрэчу ў ліпені 1929 г. дзеячоў “беларускай санацыі” з Ю. Пілсудскім і перамовах аб датэрміновым вызваленні арыштаваных “грамадоўцаў” [33]. Можна меркаваць, што дзякуючы гэтай сустрэчы ў 1930 г. большасць лідараў Грамады выйшлі на волю. 18 чэрвеня 1930 г. Р. Астроўскі, С. Станкевіч, А. Трэпка і іншыя былі прыняты прэзідэнтам Польшчы І. Масьціцкім падчас яго візіту ў Віленскае ваяводства. Прэзідэнту быў пададзены “Мемарыял беларускіх культурна-асветніцкіх інстытуцый”, у якім утрымліваўся шэраг разгорнутых патрабаванняў у адукацыйнай, палітычнай, рэлігійнай сферах. Напрыклад, прадстаўнікі групы Луцкевіча – Астроўскага прапаноўвалі ўладам вылучыць Віленскае, Навагрудскае, Палескае ваяводствы ў асобную адміністрацыйную адзінку, стварыць на гэтых землях адзіную школьную акругу з аддзелам беларускага школьніцтва, аказаць матэрыяльную падтрымку беларускім школам, гімназіям і асветніцкім арганізацыям, адчыніць кафедру беларусазнаўства ў Віленскім універсітэце і інш. [34, s. 382–383]. Тым не менш, польскі ўрад пасля гэтага мемарыялу кардынальна не змяніў свае адносіны да вырашэня “беларускага пытання” ў Польшчы. Выключэннем было, бадай, з’яўленне ў Вільні ў 1930 г. беларускай настаўніцкай семінарыі, якая, аднак, праз год была зачынена.

Праграмныя пастулаты ў справе ўзаемаадносін беларускага грамадства з польскімі ўладамі меў выступ лідара “беларускай санацыі” Р. Астроўскага падчас пасяджэння т.зв. “Грамадскага клуба” 22 сакавіка 1931 г. у Вільні, у якім прымалі ўдзел прадстаўнікі віленскіх адміністрацыйных улад, польскіх палітычных партый, грамадскіх арганізацый і прэсы. У сваім дакладзе Астроўскі заявіў, што беларускае насельніцтва імкнецца забяспечыць свае нацыянальна-культурныя патрэбы ў рамках польскай дзяржаўнасці, ад якой чакае прызнання беларусаў раўнапраўнымі грамадзянамі краіны. Дзеля гэтага, прамоўца выказаў у бок улад некалькі патрабаванняў у культурнай, гаспадарчай і адміністрацыйнай сферах: адчыніць у кожным заходнебеларускім павеце беларускую сямікласную школу, аказаць падтрымку існуючым беларускім гімназіям, стварыць кафедру беларусазнаўства ў Віленскім універсітэце, правесці аграрную рэформу і скасаваць асадніцтва, сканцэнтраваць заходнебеларускія ваяводствы ў асобную адміністрацыйную адзінку. Аднак нават такія памяркоўныя патрабаванні былі крытычна ўспрыняты на пасяджэнні прадстаўнікамі польскага істэблішменту, напрыклад, віленскім ваяводам Кіртыклісам, рэдактарам С. Мацкевічам і інш. [35]. Гэтая акалічнасць пацвярджала той факт, што польскія ўлады працягвалі прытрымлівацца палітыкі паланізацыі беларускага насельніцтва і не жадалі падтрымліваць нават тыя вузкія змены, якія прапаноўвалі прадстаўнікі паланафільскай плыні беларускага нацыянальнага руху.

**Заключэнне.** Такім чынам, у міжваенны перыяд беларускія паланафільскія арганізацыі мелі трывалыя стасункі з польскімі ўладамі на розных адміністратыўных узроўнях. Дадзеныя стасункі насілі ў большасці выпадкаў характар прыватных перамоваў, сустрэч з прадстаўнікамі ўрада ці мясцовай адміністрацыі падчас якіх ставіліся пытанні падтрымкі паланафільскага руху і забеспячэння памяркоўных патрэб беларускай меншасці ў Польшчы. Узаемаадносіны ўлад і паланафілаў былі абумоўлены ў першую чаргу неабходнасцю аказання з боку ўрадавых структур пэўнай падтрымкі прапольскім сілам у беларускім грамадстве. Але кіраўніцтва Польшчы не мела адзінай канцэпцыі ці “дарожнай карты” супрацоўніцтва з беларускімі прапольскімі арганізацыямі, што прадвызначала існаванне супрацьлеглых поглядаў на беларускіх паланафілаў з боку розных інстытутаў улады (польскі ўрад, віленская адміністрацыя, дэфензіва і інш.). Пры гэтым, трэба падкрэсліць, што ўлады вельмі абмежавана рэагавалі на ініцыятывы паланафільскіх арганізацый, бо не жадалі аказваць вялікае садзеянне любой, нават памяркоўнай, палітычнай эмансіпацыі беларускага насельніцтва.

ЛІТАРАТУРА


1. Пашкевіч, А. В. Псыхалёгія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзела польскага Генэральнага штабу / А. В. Пашкевіч, А. М. Чарнякевіч // Arche. – 2005. – № 6. – С. 214 – 271.
2. Чарнякевіч, А. М. Ад супрацоўніцтва да здрады: беларускі рух і II аддзел Польскага Генеральнага штабу 1919–1939 / А. М. Чарнякевіч // Гістарычны альманах. – 2007. – Т. 13. – С. 13 – 46.
3. Czarniakiewicz, A. “Inwestycja w lojalność”: Próby finansowania przez polskie instytucje rządowe białoruskiego ruchu narodowego / A. Czarniakiewicz // Przegląd Wschodni. – 2013. – T. XII. – Z. 4. – S. 825–862.

4. Gomółka, K. Białoruskie partie i organizacje prorządowe w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1997. – № 7. – S. 63–74.
5. Januszewska-Jurkiewicz, J. Stosunki narodowościowe na Wileńszczyźnie w latach 1920–1939 / J. Januszewska-Jurkiewicz. – Katowice : Wyd. Uniwersytetu Śląskiego, 2010. – S. 630 – 632.
6. Галэндак, М. Беларуская палітыка ў Сярэдняй Літве / М. Галэндак // Arche. – 2009. – № 3. – С. 479 – 506.
7. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). – F. 22. – Ap. 1. – B. 54. Raporty polityczne w sprawie ruchu białoruskiego na terenie Litwy Środkowej, 1921 г.
8. LCVA. – F. 22. – Ap. 1. – B. 42. Доклад о деятельности белорусских буржуазно-националистических организаций и их руководителей в Польше, Литве и странах Западной Европы с приложениями, характеризующими деятельность данных организаций, 1921 г.
9. Беларускі голас. Аднаднёўка. – 1921. – 11 сьнежня. – С. 1.
10. Аляксюк у кааперацыі // Бел. ведам. – 1921. – № 12–13. – С. 3.
11. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. – Мінск : Логвінаў, 2009. – 396 с.
12. Czarniakiewicz, A. Kwestia białoruska w planach Oddziału II Sztabu Generalnego Wojska Polskiego w latach 1919–1923 / A. Czarniakiewicz, A. Paszkiewicz // Przegląd historyczno-wojskowy. – 2011. – № 3. – S. 43 – 56.
13. Instytut Józefa Piłsudskiego w Ameryce. – Zespół : Adiutantura Generalna Naczelnego Wódza. – Teczka 701/2/39 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.pilsudski.org/archiwa/teczka.php?nonav=0&nrar=701&nrzesp=2&sygn=39. – Дата доступа: 10.10.2014.
14. Дэлегацыя Зьезду Заходняй Беларусі ў Варшаве // Раніца. – 1921. – № 2. – С. 2.
15. Цэнтральная навуковая бібліятэка НАНБ імя Я. Коласа. Аддзел рэдкай кнігі і рукапісаў. – Ф. 4. – Воп. 1. – Спр. 61. Донесения издателя «Белорусского звона» в Министерство внутренних дел.
16. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 662. – Воп. 2а. – Спр. 8. Месячные, недельные отчеты воеводских и поветовых коменд госполиции об общественно-политическом движении, 1924 г.
17. Горны, А. Вобраз беларускага паланафільства на старонках беларускамоўнага друку міжваеннай Польшчы / А. Горны // Acta Albaruthenica. – 2013. – Т. 13. – S. 294 – 304.
18. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 189. Дакументы Канферэнцыі прадстаўнікоў беларускіх палітычных партый, сялянства і інтэлігенцыі (пратаколы і выступленні), 1924 г.
19. Беларуская дэлегацыя ў Варшаве // Грамадскі голас. – 1924. – № 34. – С. 2.
20. LCVA. – F. 15. – Ap. 2. – B. 232. Sprawozdania sytuacyjne z życia społecznego i politycznego m. Wilno, 1925 г.
21. Мы трэбуем // Беларускае слова. – 1926. – № 15. – С. 1.
22. Спроба сілаў // Беларускае слова. – 1926. – № 16. – С. 2.
23. ДАГВ. – Ф. 664. – Воп. 3. – Спр. 9. Месячные отчеты по Новогрудскому воеводству, 1926 г.
24. ДАГВ. – Ф. 679. – Воп. 1. – Спр. 10. Донесения, отчеты коменды госполиции Несвижского повета о происшествиях и общественно-политическом движении на территории повета, 1926 г.
25. LCVA. – F. 15. – Ap. 2. – B. 233. Sprawozdania sytuacyjne z życia społecznego i politycznego m. Wilno, 1926 г.
26. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 242п. – Воп. 1. – Спр. 106. Интерпеляции и речи послов коммунистической посольской фракции и послов «Громады». Материалы Временной белорусской рады и др., 1926–1934 гг.
27. Паведамленьне Соймавага Клюбу Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады ў справе ўчасьця ў выбарах Прэзідэнта Польскае Рэспублікі // Беларуская справа. – 1926. – № 14. – С. 1.
28. Чарнякевіч, А. Беларускія паланафілы і Грамада. 1925 – пачатак 1927 г. / А. Чарнякевіч // Гістарычны альманах. – 2006. – Т. 12. – С. 64 – 78.
29. Czerniakiewicz, A. Raporty Romualda Ziemkiewicza z lat 1923–1925 / A. Czerniakiewicz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2007. – № 27. – S. 224 – 275.
30. ДАГВ. – Ф. 551. – Воп. 1. – Спр. 974. Сообщения МВД об антисоветской пропаганде среди белорусского населения Цябловского Фелициана, 1925 г.
31. ДАГВ. – Ф. 662. – Воп. 3. – Спр. 11. Квартальные отчеты поветовых коменд госполиции об общественно-политическом движении в Новогрудском воеводстве, 1924 – 1928 гг.
32. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам. Станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917 – 1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.
33. Z biełaruskaha žyćcia // Biełaruskaja krynica. – 1929. – № 23. – S. 2.
34. Białorusini // Sprawy Narodowościowe. – 1930. – № 3–4. – S. 380–384.
35. Беларуская справа і польскае грамадзянства // Беларускі звон. – 1931. – № 7. – С. 1.


*Пастуniў 27.05.2015*

## THE RELATIONS BETWEEN BELARUSIAN POLONOPHYLIC ORGANIZATIONS AND POLISH AUTHORITIES IN WESTERN BELARUS DURING THE INTERWAR PERIOD

***A. GORNY***

*The article touches upon little-known problem of native and foreign historiography of interaction between Belarusian polonophilic organization with the Polish authorities in Western Belarus in the interwar period. Also reveals the main forms of cooperation with the Polish authorities of such organizations as "Krajovaja suviaz", Temporarily Belarusian Rada, Lutskevich-Ostrovsky group and others. The author comes to the conclusion that the support of the authorities of propolish forces in the Belarusian society of Western Belarus had been limited and had not exceeded the policy of polonization of Belarusian population.*